# ЗАХОДНІ ФАРПОСТ САВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЫ: НЕВЯДОМЫЯ ФАКТЫ З ГІСТОРЫІ НЕГАРЭЛАЎСКАЙ МЫТНІ

**Кастусь Нашчынец**

*Артыкул прысвечаны гісторыі Негарэлаўскай мытні (1921–1939 гг.), якая ў міжваенны час з'яўлялася заходнім «фарпостам» савецкай дзяржавы на мяжы з Польшчай. Пададзены раней невядомыя факты з чыннасці савецкіх мытнікаў, звязаныя з затрыманнем кантрабанды і супрацьдзеянню шпіянажу. Параўноўваюцца прававыя і арганізацыйныя аспекты здзяйснення мытных фармальнасцяў таго і сённяшняга часу.*

**Уводзіны.** Пасля падпісання Рыжскай мірнай дамовы і з пачаткам фармавання польска-савецкай дзяржаўнай мяжы ў сакавіку 1921 г. савецкія мытныя структуры на тэрыторыі шасціпаветнай Савецкай Беларусі, якія раней былі падпарадкаваны Смаленскай мытнай акрузе, перададаваліся пад загад Аддзялення мытнага кантролю пры ўпаўнаважаным Народнага камісарыята па знешнім гандлі (НКЗГ) ССРБ. Новаўтвораныя мытні былі перасунуты на новую лінію заходняй мяжы савецкай дзяржавы. Адна з такіх мытняў – мытны нагляд №7 – спачатку дыслацыравалася ў мястэчку Койданава. Але ў хуткім часе гэты нагляд быў пераўтвораны ў мытню I-га разраду і пераведзены ў Негарэлае [1].

**Асноўная частка.** Негарэлаўская мытня з пачатку свайго стварэння стала ўяўляць сабою своеасаблівую «браму ў камуністычны свет», якая сімвалічна падзяляла савецкі і буржуазны лад жыцця. «У момант прыезду ў СССР на ст. Негарэлае, – узгадвалі ў верасні-кастрычніку 1934 г. камандзіраваныя ў Маскву прадстаўнікі Дэпартамента сельскай гаспадаркі ЗША, – адно з найболей моцных уражанняў – гэта ўражанне парадку. Мытныя фармальнасці былі выкананыя спакойна, ветліва і хутка і без той шумлівай мітусні і назойлівасці, якімі суправаджаўся пераезд [расійскай] мяжы ў дарэвалюцыйным часе» [2]. Унутраны інтэр'ер Негарэлаўскай мытні пачатку 1930-х гг., паводле ўспамінаў вядомага яўрэйскага пісьменніка Дзюлы Іеша, выглядаў наступным чынам: «Падлога пакрытая да бляску нацёртым паркетам, бакавыя сцены ўтвараюць суцэльнае акно, над

акном партрэт Леніна; трэцюю частку сцяны займае мапа СССР, дзе адзначаны вынікі першай пяцігодкі. Чацвёртая сцяна абчэплена велізарнымі, ад падлогі да столі, карцінамі. На адным палатне намаляваная сельскагаспадарчая талака за працай – трактар, малатарня, конскі табун; на іншым прадстаўлена ўзвядзенне Днепрагэса. Фарбы карцін яркія, насычаныя, адлюстроўваюць паўнату жыцця. Уздоўж сцен на шасці мовах лозунг «Пралетарыі ўсіх краін, злучайцеся!». У цэнтры залы размешчаны кругавы пульт, куды пасажыры ставяць раскрытыя для агляду валізкі. Мытнікі прафесійна адпрацаванымі рухамі прыўздымаюць бялізну і абутак, дбайна абмацваюць кожную рэч. Замежная валюта заносіцца ў дэкларацыю, бо пры ўездзе ў краіну можна прывезці фіксаваную суму грошай. Нумар фотаапарата запісваецца ў пашпарт вандроўніка. У кабеты побач са мной, якая вярталася з-за межы, канфіскуюць парыжскі парфум, суправаджаючы працэдуру тактычнымі тлумачэннямі» [3].

Але не так усё было бездакорна ўпарадкавана і наладжана на савецкай мытні, як гэта падаецца з вышэй пададзеных успамінах. У яе дзейнасці хапала недахопаў і праблем, выкліканых фактарамі як аб’ектыўнага, так і суб’ектыўнага характару. У першую чаргу адзначым недастатковую матэрыяльную забяспечанасць мытных супрацоўнікоў, ураўнілаўку ў зарплаце, «незалежна ад катэгорыі, стажу і ведання замежнай мовы». Падчас тэхнічнай нарады супрацоўнікоў Негарэлашчскай мытні ад 30 лістапада 1931 г. адзначаліся, што такая «ўраўнілаўка» стварае «апатыю і ліквідатарскія настроі ў асобных супрацоўнікаў, гатовых пры першым зручным выпадку парваць усякую сувязь з мытнай установай». Таксама паведамлялася аб цяжкіх бытавых ўмовах нясення службы і жыцця на мытні: незадавальняючае жыллё, незадавальняючае забяспячэнне мытнікаў і членаў іх сямей прадуктамі харчавання; фактычная адсутнасць якіх-небудзь культурна-забаўляльных мерапрыемстваў, каб заняць адпачынак дзяржаўных службоўцаў у вольны час ад працы (акрамя наяўнасці невялічкай бібліятэкі). Супрацоўнікі мытні былі суткамі прывязаныя да сваёй установы і змушаныя працаваць у паза рочны час. Кіраўніцтва мытні сігналізавала пра тое, што маецца недакамплект інспектараў і кантралёраў, «але папоўніць штат магчымасці няма, бо жадаючых пайсці на працу ў мытню не знаходзіцца» [4].

Сёння будучыя мытнікі – студэнты факультэта міжнародных адносін БДУ, падчас навучання авалодваюць дзвюмя замежнымі мовамі. Раўналежна са спецыяльнасцю мытніка яны атрымліваюць пасведчанне

тлумача-рэферэнта. У савецкі час, каб удасканаліцца ў веданні замежнай мовы, пры мытнях ствараліся «моўныя гурткі», але іх арганізацыя і функцыянаванне прызнавалася незадавальняючай. Так для слухачоў гуртка па вывучэнні нямецкай мовы пры Негарэлаўскай мытні бракавала падручнікаў і кваліфікаваных педагогаў. У 1935 г. паведамлялася: «Для правядзення заняткаў па нямецкай мове мытні вельмі неабходна мець 7 штук падручнікаў нямецкай мовы Іагансэна[1]. За атрыманнем іх мы ўжо месяц таму назад звярнуліся з просьбай у Цэнтральнае выдавецтва [у Маскву, – заўв. аўтара], але дагэтуль апошняе іх не высылае нам, выслаўшы толькі падручнікі па ангельскай мове» [5]. А вось паведамленне годам раней: «<…> мы знаходзілі проста чалавека, які меў навыкі валодання замежнай мовай, але не меў досведу тлумача. Заняткі зводзіліся да звычайнага завучвання асобных слоў і фраз, што давала мала выніку» [6].

Адзначым факты, калі супрацоўнікі мытні, праявіўшыя стараннасць і здольнасці пры вывучэнні замежных моў, атрымоўвалі павышэнні ў званнях і надбаўкі. Сведчаннем таму – выпіска з загада № 18 па Негарэлаўскай мытні за 17 сакавіка 1934 г.: «Кантралёрам Маляўка і Хазанаву прысвоіць званні мытных тлумачоў 3-й катэгорыі па нямецкай мове. Аплату рабіць па 20 руб. у месяц. Інспектару Новікаву прысвоіць званне тлумача 2-й катэгорыі па нямецкай мове. Даплату рабіць па 25 руб. у месяц» [7].

Не на належным узроўні была наладжана каардынацыя і ўзаемасувязь з працаваўшымі на мяжы памежнікамі, якія былі падпарадкаваны Дзяржаўнаму палітычнаму ўпраўленню СССР (з 1934 г. – Народнаму камісарыяту ўнутраных спраў). У 1936 г. адбыўся невялікі канфлікт паміж мытняй і памежным кантрольна-прапускным пунктам (КПП) у Негарэлым: была затрымана кантрабанда ў грамадзяніна Ірана Ісвагані Гусейна на суму 560 савецкіх руб. і 15 англійскіх фунтаў стэрлінгаў. Кантрольна-прапускны пункт 16 памежнага атрада НКУС СССР паведамляў: «У вашых звестках (маецца на ўвазе справаздача Негарэлаўскай мытні, – заўв. аўтара) гэтае затрыманне значыцца як, самастойнае затрыманне мытні, у той час, як затрыманне кантрабанды выключна праведзена па ініцыятыве КПП, нашым кантралёрам Дабрынiным» [8]. У адказ кіраўніцтва Негарэлаўскай мытні пісала памежнікам: «Нават сумесным гэта затрыманне лічыць

---

[1] Маецца на ўвазе кніга А. Іогансэна «Учебник немецкого языка для взрослых». – Москва: Центральное издательство народов СССР, 1932.

немагчыма, яно цалкам належыць нашаму кантралёру Краўчуку, які, ў сваю чаргу, проста распавёў Дабрыніну аб незвычайным чамадане іранца». Спрэчную справу разглядала Галоўнае мытнае ўпраўленне пры Наркамаце знешняга гандлю СССР і стала на бок мытнікаў. Падобная нездаровая канкурэнцыя паміж дзвюмя дзяржаўнымі ўстановамі перашкаджала выніковасці па сумеснай ахове дзяржаўнай мяжы. У пратаколе № 1 «Тэхнічнай нарады супрацоўнікаў Негарэлаўскай мытні» ад 2 лютага 1932 г. адзначалася, што «нягледзячы на цэлы шэраг сумесных пасяджэнняў з прадстаўнікамі чыгункі аб рэгуляванні і паляпшэнні на ст. Негарэлае ўмоў дагляду экспартных адпраўленняў у зборных вагонах, да гэтага часу нічога не палепшылася. Вагоны загружаюцца чыгуначнікамі без ведама мытні, а толькі па дамове з Саюзтрансам. Як вынік, дзяжурны інспектар мытні цалкам пазбаўлены магчымасці зрабіць праверку грузаў, што загружаюцца ў зборныя вагоны». Гэта вяло да спагнання штрафу ў памеры не болей за 100 руб. з адпаведных устаноў і арганізацый. Але, што цікава, пратаколы аб пакараннях штрафамі ў архівах не выяўлены. Гэта можа тлумачыцца тым, што гэтыя штрафы проста не спаганяліся з дзяржаўных устаноў, парушаўшымі арт. 157 Мытнага Кодэксу СССР 1928 г., паводле якога «штрафы накладаюцца за наступныя парушэнні мытных пастаноў: пагрузку, перагрузку або выгрузку грузу без належнага дазволу мытнай установы; пагрузку ў цягнік, які адпраўляецца са станцыі чыгункі, як памежнай, так і размешчанай на партовай тэрыторыі, унутры межаў СССР грузаў, што падвергнуліся мытнаму агляду, калі яны падлягалі яму» [9].

Нягледзячы на пэўную канкурэнцыю паміж памежнымі ўстановамі, трэба прызнаць, што значная доля затрыманняў кантрабанды і кантрабандыстаў адбывалася або падчас сумесных дзеянняў мытнікаў і памежнікаў. Так, 23 жніўня 1932 г. у 100 метрах ад мяжы памежнікамі быў затрыманы пры нелегальным пераходзе мяжы грамадзянін Адам Невяроўскі, жыхар Польшчы, пры асабістым даглядзе якога было знойдзена 200 руб. савецкіх грошаў. Здавалася б, шэраговы выпадак – затрыманне нелегала, якіх у той час была не адна і не дзве сотні, а тысячы рублёў, – калі б не факт таго, што пры затрыманні Невяроўскі аказаў памежнікам сур’ёзнае узброенае супраціўленне, а пасля на допыце сведчыў, што ён «польскі шпіён, які атрымаў валюту ў Стоўбцах у II-м аддзеле польскай выведкі 22 жніўня для выканання заданняў шпіёнскага характару і набыцця тавараў савецкай вытворчасці» [10]. Быў ён шпіёнам або звычайным гандляром-кантрабандыстам, якога прымуслі даць такія паказанні, правесці

аб'ектыўнае даследаванне гэтага факту сёння немагчыма. Вось яшчэ адны выпадак, пра які ўзгадвае стаўбцоўскі старажыл Аркадзь Змачынскі: «У 1924 г. на польскі бок у Стоўбцы была нелегальна заслана Вера Харужая. Хадзіла яна па вёскам ды мястэчкам, агітуючы за савецкую ўладу, маўляў, за кардонам шмат працы, якая добра аплачваецца і значна лепей жыць. Паслухалі яе нашыя хлопцы, ды і вырашалі некаторыя з іх паспрабаваць шчасця на савецким баку. Са Стоўбцаў яны выйшлі ўвечары, ноччу падыйшлі да рэчцы і пачалі патаемна, зняўшы штаны, з вялікай асцярогай і акуратнасцю пераходзіць мяжу. Некалькім чалавекам пашчасціла – перайшлі яны рэчку, як раптам нехта зачапіўся ў рэчцы – паляцелі пырскі вады. Назіральнік з вышкі пачуў гэта і падняў трывогу; польскія памежнікі хутка зрэагавалі, наляцелі і схапілі тых, хто не паспеў перайсці мяжу, патрапіць туды, дзе «хапае ўсім працы, жывуць значна лепш». Тым, каму «не пашчасціла», далі па году турмы. А вось тых, хто перайшоў мяжу, схапілі савецкія памежнікі ды расстралялі ў Дзяржынску як польскіх шпіёнаў…»[1].

Барацьба з кантрабандай была заўсёды складанай справай. Акрамя цяжкасцяў у пошуку схаваных тавараў, меліся таксама юрыдычныя нюансы, звязаныя з недасканалым заканадаўствам. Напрыклад, прадстаўнік Чэхаславакіі Франц Холеў на пытанне: «Навошта правозіў таемным чынам сукно – адрэзы чорнага драпу, сшытыя на жывую нітку?» – сумленна адказваў: «Думаў, што падчас дагляду гэтага не заўважаць і я правязу адрэзы пад выглядам пледу, які дазволены мне па норме». Аднак у сваёй пастанове ГМУ адзначае: «Плед быў паказаны пры мытным даглядзе, ніякага ўтойвання няма, таму адмяніць канфіскацыю і выпусціць пад аплату пошлінай» [11]. Насамрэч, адпаведна з артыкулам 164 МК СССР, кантрабандай з'яўляліся толькі рэчы, схаваныя ад мытнага кантролю. Падчас дазволенага двухтыднёвага тэрміну Холеў звярнуўся ў мытню з лістом з тлумачэннем і 25 рублямі, неабходнымі для аплаты памеру пошліны – і праз некаторы час атрымаў свой «плед» у Чэхаславакіі. Але ў большасці выпадкаў ГМУ пацвярджала рашэнні Негарэлаўскай мытні. Часам мытны дагляд уяўляў сабой практыкаванні па логіцы і арыфметыцы. Так у 1934 г. праходзіў мытны кантроль грамадзянін Кітая Чжоу Цін Лан, ехаўшы транзітам праз СССР. У яго пашпарце мытнікі знайшлі адзнаку

[1] Запісана аўтрам артыкула ў прыватнай бяседзе з А. Змачынскім.

Уладзівастоцкай мытні, што дадзены грамадзін вязе валізак. Аднак ніякага валізку ў Негарэлым з ім ужо не было, Цін Лан тлумачыў гэта крадзежом, маўляў, скралі валізак недзе ў цягніку. Але, параўнаўшы колькасць грашовых сродкаў, задэклараваных ва Уладзівастоку і ў Негарэлым, дадаўшы выдаткі на пакупку квіткоў на цягнік «Уладзівасток–Негарэлае», мытнікі прыйшлі да высновы, што валізак з рэчамі быў прададзены, бо сума наяўных грошай пасажыра значна перавышала раней задэклараваныя. Быў адпраўлены запыт на канфіскацыю у ГМУ СССР з падрабязным тлумачэннем сітуацыі. Хутка быў атрыманы станоўчы адказ і падзяка за дбайную і ўдумлівую працу [12].

Як і сёння, пры затрыманні тавараў іх уладары пачыналі пісаць скаргі, не пагаджаліся з вердыктамі мытні. Часам скаргі насілі кур’ёзны і зусім несур’ёзны характар. Так грамадзянка Чэхаславакіі Марыя Білек таемным чынам правозіла два адрэзы тканіны, зашытых у коўдру і не прад’яўленых мытнікам. Кантрабанда была знойдзена і канфіскавана, аднак хутка мытня атрымала скаргу-тлумачэнне ад Марыі Білек: «Прашу яшчэ раз выбачыць мне маю памылку пры мытным даглядзе рэчаў, якую я зрабіла з-за таго, што я вельмі нярвовая і адразу ж разгубілася, моцна знервавалася, засмуткавала і забылася ўказаць Негарэлаўскай мытне, што маю рэчы, зашытыя ў коўдру. Зашыла я іх не каб схаваць ад мытнікаў, а проста каб не згубіліся падчас вандроўкі» [13].

Адной з функцый мытнікаў было выяўленне ідэалагічна небяспечных друкаваных матэрыялаў і прэсавых выданняў. Канфіскацыі падлягала рознага кшталту замежная літаратура і перыёдыка, а таксама кнігі духоўнага зместу. Так, 22 ліпеня 1935 г. у грамадзяніна ЧСР Яна Міхноўскага была канфіскавана «кніга дарэвалюцыйнага выдання на нямецкай мове «Вучэнне Хрыста» Марціна Лютэра [14].

Цікава будзе параўнаць правядзенне асабістага мытнага дагляду тых гадоў і ў нашыя дні. Зараз, адпаведна з артыкулам 117 Мытнага кодэксу Мытнага саюза, гэтая форма мытнага кантролю з’яўляецца выключнай формай, які праводзіцца паводле пісьмовага рашэння кіраўніка (начальніка) мытнага органа, упаўнаважанага ім намесніка кіраўніка (начальніка) мытнага органа альбо асоб, іх якія замяшчаюць, пры наяўнасці дастатковых падстаў лічыць, што асоба, якая следуе праз мытную мяжу, хавае пры сабе і добраахвотна не выдае тавары, што перамяшчаюцца з парушэннем мытнага заканадаўства Мытнага саюза» [15]. А ў 1920–1930-я гг. нічога выключнага

ў здзяйсненні асабістага мытнага дагляду не было і ніякіх пісьмовых рашэнняў на гэта было не патрэбна.

У 1936 г. здарыўся неардынарны выпадак з грамадзянінам Кітая Чу Пэй Юанем, выкладчыкам фізікі з Бейпінскага ўніверсітэту. Пасля праходжання мытнага дагляду ў рэвізійнай зале ён падвергнуўся прымусоваму асабістаму мытнаму дагляду – у выніку чаго ў адной з кішэняў пінжака быў знойдзены запячатаны канверт з паведамленнем на кітайскай мове і 6 даляраў ЗША. Адпаведна з артыкулам 167 Мытнага кодэксу – прадметы, не прадстаўленыя для мытнага кантролю – затрымліваюцца. Так і адбылося: гэтыя рэчы ў кітайскага прафесара былі канфіскаваныя [16]. Яшчэ адзін выпадак, таксама ў 1936 г., адбыўся з прадстаўніком ЗША – рабочым Карлам Крафтам. Падчас асабістага дагляду ў яго была выяўлена адна пара дамскіх туфляў, схаваных незвычайным чынам – падвешаных да пасу нагавіцаў пад пінжаком. Было пастаноўлена канфіскаваць тавар, мытны кошт якога ацэньваўся ў 100 савецкіх руб. [17]. 1 траўня 1937 г. пры асабістым даглядзе грамадзяніна Аўстрыі Людвіга Розэнфельда, у ягоных шкарпэтках былі выяўлены 300 чэхаславацкіх крон і 10 даляраў ЗША [18]. А 20 красавіка 1937 г., пры той жа мытнай працэдуры, у грамадзянкі Венгрыі Іланы Фабіян было канфіскавана 5 амерыканскіх даляраў, якія яна хавала ў боціках сваёй трохгадовай дачкі Елізаветы [19].

А вось яшчэ адзін незвычайны выпадак на Негарэлаўскай мытні, які дае магчымасць параўнаць тагачаснае і сучаснае мытнае заканадаўства. З акту, складзенага супрацоўнікамі Негарэлаўскай мытні 24 лістапада 1932 г.: «<…>пры выездзе за мяжу грамадзянкі ЗША Д. Гівэ Меры, у апошняй не аказалася ўвезенага раней легкавога аўтамабіля маркі «Форд» за № 501952 чорнага колеру, які быў названай грамадзянкай прададзены Саўнаркаму Грузіі ў г. Тбілісі за 18 тыс. руб. саўзнакамі. З прычыны таго, што названы аўтамабіль ўвезены ў СССР пад абавязак зваротнага вывазу за мяжу і незаконна быў прададзены ў СССР без адпаведнага на тое дазвалення НКЗГ ГМУ, продаж быў прызнананы не законным, пра што і сведчыць складзены акт» [20]. Парушэнне, апісанае ў акце, падпадала пад арт. 97 Мытнага кодэксу СССР, паводле якога «ад аплаты пошлінай вызваляюцца <…> прадметы замежнага паходжання, што увозяцца часова паводле адмысловага дазвола Галоўнага мытнага ўпраўлення пад умовай зваротнага вывазу іх з тэрыторыі СССР на працягу прызначанага ў кожным асобным выпадку тэрміна, але які не можа перавышаць тэрмін у 1 год» [21]. Сёння, паводле Мытнага кодэксу Мытнага саюза аналагам гэтай працэдуры

з’яўляецца працэдура часовага ўвозу (гл. 37): часовы ўвоз вызначаецца як «мытная працэдура, пры якой замежныя тавары выкарыстоўваюцца на працягу ўсталяванага тэрміна на мытнай тэрыторыі Мытнага саюза з умоўным вызваленнем, поўным або частковым, ад выплаты ўвазных мытных пошлін, падаткаў і без ужывання мер нетарыфнага рэгулявання з наступным змяшчэннем пад мытную працэдуру рээкспарту» [15].

Нярэдкім было ў той час парушэнне арт. 144 Мытнага кодэксу СССР, паводле якога «жыхары памежнай паласы, што прапускаюцца праз мяжу і бліжэйшых памежных месцах на кароткі час, а таксама чыгуначныя і іншыя служачыя, якія едуць праз мяжу па абавязкам службы, карыстаюцца правам мець пры сабе без уплаты мытных і іншых збораў толькі прадметы, якія неабходныя ім падчас знаходжання ў дарозе і выкарыстоўваюцца для ўласнага ўжывання». Газета «Савецкая Беларусь» у першым нумары за 1925 г. паведамляла ў нататцы «За кантрабанду»: «На лаве падсудных – паравозны машыніст Павей і качагар Кануноў. У ліпені 1924 г. на ст. Негарэлае прадстаўнікі мытні агледзелі цягнік № 847 і за ашалёўкамі выявілі 20 тузінаў галштукатрымацеляў, а ў кутах тэндэру – па бутэльцы спірту <...> Вярхоўны Суд Рэспублікі, разгледзеўшы гэтую справу, прысудзіў Павею і Канунову 3 гады пазбаўлення волі без строгай ізаляцыі. Але, прымаючы пад ўвагу іх нізкі культурны ўзровень і цяжкае матэрыяльнае становішча, суд знайшоў магчымым прысуд лічыць умоўным на працягу 5 гадоў» [22]. Такі мяккі прысуд можна растлумачыць «пралетарскім паходжаннем» асуджаных. Але варта адзначыць, што чыгуначнік-машыніст, дапушчаны да замежных рэйсаў – гэта была рабочая эліта, матэрыяльнае становішча якой было не самым цяжкім сярод іншых прадстаўнікоў працоўных мас СССР. Кантрабандная чыннасць чыгуначнікаў была нярэдкай справай у 1920-я гг. – у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захоўваецца даволі важкая справа «Матэрыялы расследавання правозу кантрабанды смажчыкамі цягнікоў «Стоўбцы–Манчжурыя» амаль на 250 старонак.

Розных хітрасцяў у правозе кантрабанды ў асабістых рэчах, можна пералічаць доўга. 30 сакавіка 1937 г. пры мытным даглядзе ў гадзінніку-будзільніку грамадзяніна Чэхаславакіі Франца Дзіпста быў выяўлены скрутак з 17 далярамі ЗША і 120 чэхаслвацкімі кронамі [23]. Гісторык А. Валахановіч так характарызуе кантрабандысцкі «бізнес» часоў НЭПу: «Найбольшы прыбытак прыносілі спірт, або гарэлка. Побач з Негарэлым, якраз па мяжы праходзіла рэчка. Што рабілі кантрабандысты. Яны бралі бервяно, выгаблёўвалі ўсю ўнутраную частку, засоўвалі туды бутэлек дзесяць, зверху пры-

мацоўвалі рэшткай дрэва нібы крышкаю і прывязвалі вяроўку, якую таемна закідвалі на другі бераг і бервяно само плыло ў рукі кантрабандыстаў з іншага берагу. Ішлі памежнікі і нічога падазронага не заўважалі»[1].

Хто ж працаваў у той час на мытных органах? Матэрыялы асабістых спраў супрацоўнікаў Негарэлаўскай мытні, што захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве Мінскай вобласці, дазваляюць скласці іх калектыўны сацыялагічны партрэт. У 1926 г. колькасць супрацоўнікаў Негарэлаўскай мытні складаўся з 43 чал. (з іх 12 – з сярэдняй і 31 – з пачатковай адукацыяй). Далей, паступова склад мытні пачаў змяншацца. На 1 кастрычніка 1930 г. тут працавала ўжо 27 чал. Але на астатніх мытнях, што дзейнічалі на тэрыторыі БССР у суме налічвалася толькі 12 чал. У 1932 г. лічба супрацоўнікаў Негарэлаўскай мытні зменшалася да 14 чал. Паводле паслужнога спісу на канец 1935 г. іх агульная колькасць скарацілася да 12. У штат мытні тады ўваходзілі: 1 старшы інспектар, 2 інспектары, 6 кантралёраў, адзін старшы істопнік, адзін старшы бухгалтар і адзін кур'ер-прыбіральнік. З іх – 9 мужчын і 3 жанчыны, 6 беспартыйных і 6 членаў ВКП(б) або камсамольцаў. Узрост вагаўся ад 21 да 45 гадоў; паводле нацыянальнага паходжання: 6 беларусаў і 6 прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў. Найбольшую зарплату атрымліваў старшы інспектар – 300 руб., найменшы – істопнік – 140 руб. [24].

Рэпрэсіі, якія закранулі Беларусь у 1930-я гады, не абышлі і мытнікаў. Так, 28 жніўня 1937 г. быў арыштаваны супрацоўнік Негарэлаўскай мытні Іосіф Снарскі, паляк па нацыянальнасці. Ён быў прыгавораны камісіяй НКУС СССР і Пракурорам СССР да растрэлу (выкананы 15.12.1937 г.) паводле арт. 68 Крымінальнага кодэксу СССР – «шпіянаж, перадача альбо збіранне з мэтай перадачы звестак (у тым ліку эканамічных), што з'яўляюцца па свайму складу дзяржаўнай таямніцай <…> замежнай дзяржаве, контррэвалюцыйнай арганізацыі або прыватным асобам» [25].

Роля Негарэлага як «заходняй брамы і фарпосту СССР» абумовіла значную колькасць вядомых краіне і свету пасажыраў, што перасякалі дзяржаўную мяжу СССР праз названую мытню. Сярод пасажыраў, якія праходзілі мытны дагляд у Негарэлым былі такія слынныя постаці, як літаратары У. Маякоўскі, М. Горкі, А. Талстой, М. Шолахаў, Г. Уэлс і Р. Ралан,, лятун В. Чкалаў, палітычныя і грамадскія дзеячы М. Бухарын і Э. Ідэн,

[1] Запісана аўтрам артыкула ў прыватнай бяседзе з А. Валахановічам.

шахматысты Х. Капабланка і М. Батвіннік. Патрабавала гэта і адпаведнага узроўню сервісу і ўмоў. Начальнік Беларускага аддзялення Галоўнага мытнага ўпраўлення Вейзагер паведамляў у Маскву як раз аб дрэнных умовах сервісу для абслугоўвання пасажыраў: «З павелічэннем пасажырскага руху праз Негарэлае і Бігасава паставіў пытанне аб стварэнні адпаведных выгод і ўмоў на памежных станцыях, дзе па тых або іншых выпадках вельмі часта пасажыру прыходзіцца затрымоўвацца на мяжы на 1–2 і нават 3 сутак. Значныя стаянкі цягнікоў на гэтых станцыях пакідаюць у часцы пасажыраў на даволі доўгі час. Аднак у абслугоўванні пасажыраў з нашага боку справа пастаўлена кепска. Калі, дзякуючы патрабаванням мытняў, таксяк на станцыях абсталяваныя пакоі для пасажыраў, якія раней размяшчаліся для начлегу прама на падлозе рэвізійнай залы, то справа з іх сілкаваннем да гэтага часу пастаўлена дрэнна, нягледзячы на то што гэтае пытанне своечасова было даведзены да Наркамгандлю. Такія ўмовы і кошты не абгрунтаваныя рэчаіснасцю, адштурхваюць пасажыраў, фактычна прыводзяць да палітычнага ляпсусу, прымушаюць пасажыра запасацца яшчэ за мяжой прадуктамі харчававання на дарогу, у выніку мы губляем у валюце» [27].

Хапала сярод пасажыраў і дыпламатаў. У Негарэлым спыняліся нямецкія амбасадары Фрыдрых Вернер фон Зак, Герман Урыг, Герберт Дзірксэн, польскія амбасадары Юліуш Лукашэвіч і Віктар Дрыммер, французкі амбасадар Шарль Альфан, а таксама савецкі дыпламат Іван Майскі. Апошні так узгадваў праходжанне мяжы ў Негарэлым: «Вяртаючыся неяк з паездкі ў Лондан, нам распавялі, што на днях на станцыі Негарэлае адбылася такая гісторыя. Пры перасадцы з вагона заходнееўрапейскай каляіны ў наш вагон ношчык, што нёс асабісты багаж польскіх дыпкур'ераў у мытную залу, выпадкова выпусціў на бетонавую падлогу іх драўляную ахайную скрыню. Скрыня разбілася, і з яе пасыпаліся... жаночыя панчохі, цюбікі губной памады, пудра і іншы парфум. У гэты момант у зале знаходзіўся начальнік памежнай аховы. Ён бачыў усё гэта, і яму нічога не заставалася, як сказаць польскаму дыпкур'еру: – Ай-ай-ай, як усё гэта непрыемна... Паверце, я бы жадаў пазбегнуць галоснасці, але служба ёсць служба. Прыйдзецца скласці акт... Акт быў складзены з пералікам усяго, што было ў пабітай скрыні…» [28]. Насамрэч, дагляд дыпламатаў і консулаў заўжды выклікаў цяжкасці. У тыя часы ён рэгуляваўся артыкулам 150 Мытнага кодэксу СССР. Цяпер гэтыя пытанни рэгулююцца главой 45 Мытнага кодэксу Мытнага саюзу. У абодвух выпадках гэтыя асобы валодалі высокай ступенню недатыкальнасці і атрымоўвалі шэраг ільгот паводле норм міжнароднага звычая, якія былі

замацаваны ў Гаванскай канвенцыі аб дыпламатычных служачых 1928 г. Вось яшчэ адзін выпадак, які адлюстроўвае творчы і шматбаковы падыход мытнікаў. У снежні 1935 г. адзін знаходлівы японскі дыпламат спрабаваў у двух валізках вывезці за мяжу праз КПП «Негарэлае» дзвюх жанчын-шпіёнак. Памежнікі атрымалі інфармацыю аб падрыхтоўцы акцыі аператыўным шляхам. Але дыпламатычны багаж надглядаць забаранялася. Тады памежнікі і мытнікі вырашылі ўсяляк зацягваць працэс афармлення дакументаў і правядзення мытных фармальнасцяў. Пры надглядзе валізкі варочалі, «неспадзявана» ранялі, незаўважна пракалывалі шылам. У выніку нелегалкі не вытрымалі доўгай адсутнасці свежага паветру і свайго, у літаральным сэнсе слова, пахілага становішча і выявілі сябе самі [29].

Нярэдка праз Негарэлаўскую мытню праходзілі спецгрузы: тэхналагічнае абсталяванне і ваенная тэхніка з Германіі, золата, валюта і культурныя каштоўнасці. Мастацтвазнавец С. Ратгауз ўзгадваў: «Каму не знаёмая скульптурная група «Рабочы і калгасніца» В. Мухінай, усталяваная ля ўваходу на Ўсесаюзную выставу дасягнення народнай гаспадаркі СССР. Першая мая сустрэча са скульптурай адбылася не ў Маскве, а ў Беларусі, на станцыі Негарэлае. Гэта было ў канцы сакавіка 1937 г. Нехта паказаў на вялізны груз, які займаў адзін з чыгуначных шляхоў: «Скульптуру вязуць у Парыж на выставу». Я здзівіўся: «Такую вялікую?» Для яе быў пададзены цягнік, які складаўся з 26 платформаў. Калі адмысловы груз прыбыў у Негарэлае, да яго транспарціроўкі далучыліся і транспартнікі Беларусі. Незвычайны груз быў разабраны на мноства блокаў. Для гэтага праводзілася на заводзе нават своеасаблівая рэпетыцыя, якая пацвердзіла магчымасць перавозкі. Разам з асноўным каркасам груз важыў каля 75 тон. Асобныя дэталі займалі цэлыя платформы <...> У складзе гэтага адмысловага цягніка знаходзіўся пасажырскі вагон. У ім да Парыжу ехалі супрацоўнікі Цэнтральнага навукова-даследнага інстытута машынабудавання, які ўдзельнічаў у вырабе скульптурнага шэдэўра. З дапамогай прывезеных з сабой прыладаў група савецкіх і французскіх спецыялістаў – інжынеры, зваршчыкі, мантажнікі – сабрала і ўсталявала скульптуру ў савецкім павільёне за 11 дзён. А праз некаторы час пасля зачынення выставы ўжо шырока вядомая свету кампазіцыя «Рабочы і калгасніца» такім жа шляхам перасекла мяжу ў Негарэлым ў зваротным напрамку» [26].

**Заключэнне.** Гісторыя чыннасці Негарэлаўскай мытні сканчваецца ўвосень 1939 г. У адпаведнасці з Пактам Молатава-Рыбентропа, 17 верасня 1939 г. СССР пачаў «вызваленчы паход» у Заходнюю Беларусь. Як вынік, у

сярэдзіне лістапада 1939 г. савецкая мытня ў Негарэлым на старой лініі дзяржаўнай мяжы была зліквідавана. 20 лістапада таго ж году была заснавана новая мытня ў Брэсце. На гэтым завершаецца і наш аповед пра негарэлаўскіх мытнікаў, у якім немала было цікавых і нават неверагодных падзей, схаваныя ў стосах архіўных спраў.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Острога, В.А. История таможенного дела и таможенного права Беларуси: учеб. пособие / В.А. Острога. – Минск: БИП-С, 2005. – 192 с.
2. Joseph E Davies. Mission To Moscow/ Joseph E Davies. – Victor Gollancz Limited, 1939. – 415 p.
3. Ийеш, Д. Россия. 1934. Ворота / Д. Ийеш. – Москва: Хроникёр, 2005. – 56. с.
4. Дзяржаўнаы архіў Мінскай вобласці (далей ДАМВ), ф. 614, воп. 1, спр. 43, арк. 38.
5. ДАМВ, ф. 614, воп. 1, спр. 161, срк. 9.
6. ДАМВ, ф. 614, воп. 1, спр. 161, арк. 34.
7. ДАМВ, ф. 614, воп. 1, спр. 161, арк. 18.
8. ДАМВ, ф. 614, воп. 1, спр. 212, арк. 64.
9. ДАМВ, ф. 614, воп. 1, спр. 726, арк. 55.
10. ДАМВ, ф. 614, воп. 1, спр. 212, арк. 107.
11. ДАМВ, ф. 614, воп. 1, спр. 212, арк. 74.
12. ДАМВ, ф. 614, воп. 1, спр. 102, арк. 3.
13. ДАМВ, ф. 614, воп. 1, спр. 162, арк. 8.
14. ДАМВ, ф. 614, воп. 1, спр. 162, арк. 148.
15. Таможенный кодекс таможенного союза – одобр. Советом Респ. Беларусь 30 июня 2010 г. – Минск: Амалфея, 2010. – 376 с.
16. ДАМВ, ф. 614, воп. 1, спр. 212, арк. 53.
17. ДАМВ, ф. 614, воп. 1, спр. 212, арк. 59.
18. ДАМВ, ф. 614, воп. 1, спр. 258, арк. 1.
19. ДАМВ, ф. 614, воп. 1, спр. 260, арк. 1.
20. ДАМВ, ф. 614, воп. 1, спр. 143, арк. 38.
21. Таможенный кодекс СССР: утвержден Постановлением ЦИК и СНК СССР от 19 декабря 1928 г. // Собрание законов и распоряжений Рабоче-крестьянского Правительства СССР, издаваемое Управлением Делами Совета Народных Комиссаров Союза ССР и Совета Труда и Обороны. – Москва, 1929.
22. Крапивин, С. Тачанка с двойным дном / С. Крапивин // Во славу родины. – 2012. – №189. – С. 11–12.
23. ДАМВ, ф. 614, воп. 1, спр. 250, арк. 1.
24. ДАМВ, ф. 614, воп. 1, спр. 161, арк. 63.
25. Уголовный кодекс Белорусской Советской Социалистической Республики: Утв. ЦИК БССР на 3-й сес. 8-го созыва, 23 сент. 1928 г. // СЗ БССР. – 1928. – №30. – С. 287.

26. Гордиенко, С. Скульптура веры / С.Гордиенкон // Беларусь Сегодня. – 2013. – №49. – С. 10.
27. Крапивин, С. Тачанка с двойным дном / С.Крапивин // Во славу родины. – 2012. – №188. – С. 11–12.
28. Майский, И.М. Воспоминания советского дипломата, 1925–1945 гг. / И.М. Майский [Тэкст]. – Москва: Наука, 1971 – 672 с.
29. Ляхоўскі, У.В.. Коласаўская памежная застава і мытня ў Стоўбцах у 1921 – 1939 гг.: перакрыжаванне дзяржаў і людскіх лёсаў / У.В. Ляхоўскі, К.М. Нашчынец // Актуальныя пытанні мытнай справы – 2012. – Вып. 2. – С. 146.

**The customs in Negoreloye - western outpost of the Soviet state: unknown facts and rare details. (Kanstantsin Nashchynets).**

*The article is dedicated to the history and activities of the customs in Negoreloye, which was the last "outpost" of the Soviet state to the state border with Poland, was the gate through which passed a large number of prominent personalities in the 1921–1939 years. The article discusses the most interesting breach of customs control and customs activities. It comparisons the customs formalities of the interwar period and the present time.*

*Артыкул паступіў 13 чэрвеня 2013 г.*

***e-mail аўтара:*** *kostik060193k@tut.by*